# 1200 ВЁРСТ ПА БЕЛАРУСІ

Міхась ЧАРОТ

(З ПАДАРОЖНАГА БЛЁК-НОТУ)

### 13 чэрвеня

Гэты дзень надзвычайна багаты прыемнымі ўражаньнямі.

Мне першы раз прышлося пабываць на кардоннай фабрыцы.

Загадчык вырабчага аддзелу паказаў з пачатку да канца — як з дрэва вырабляецца кардон, які ў сырым матар'яле пасылаецца на другія фабрыкі для вырабу ўсіх гатункаў паперы...

— Вось бы нам машыны падрапараваць, тав. Чарвякоў,— гаварылі рабочыя,— тагды справа не так пайшла бы... А завод то мы самі пастараліся пусьціць — нічога, справа прыбытная...

Унізу, недалёка ад заводу ўецца бліскучай істужкай Днепр.

На хвалях яго плытагоны едуць паціху на Украіну,— плыты гоняць, лес сплаўляюць з Беларусі...

— А вось там,— паказвае мне рукою стары рабочы,— за тымі будынкамі, дзе Днепр заварачвае крута ўлева, стаіць замак графіні Боны... Прыгожае мейсца... Там рэчка Друць упадае ў Днепр, і паміж двумя рэчкамі нібы рог такі выходзіць, дзе і пабудован замак... Вось ад гэтага мейсца, ад гэтага рогу і горад, як гавораць, назваўся Рагачоў...

Пасьля фабрыкі мы зайшлі наведацца ў дзіцячы дом...

Тым часам у Першамайскім садзе ўжо быў выстраен увесь гарнізон. Чырвонаармейцы-пераменьнікі захацелі вітаць усебеларускага старасту.

У гадзін адзінаццаць Чарвякоў пад гукі музыкі і гучныя воплескі выступіў перад чырвонаармейцамі...

Выехалі з Рагачова зразу пасьля мітынгу. Пры выезьдзе я не прамінуў харашэнька агледзець тое мейсца, скуль Рагачоў мае сваю назву — як раз непадалёку ад замку графіні Боны нам і прышлося праяжджаць...

Зноў роўная шасэйная дарога. Імчымся так хутка, што ў шапцы ня можна сядзець — зрывае вецер. Старшыня Рагачоўскага іспалкому едзе з намі. Ён называе нам кожную вёску, тлумачыць, як жыве там сялянства, як прайшло землябудаўніцтва, чым сялянства нездаволена зараз...

Вось і Доўск...

Наша шасэ перасякаецца з шасэ, якое ідзе з Магілёва на Кіеў...

Стаяць белыя будынкі пры скрыжаваньні шасэйных дарог,— гэта былўшыя царскія палацы. Зараз у іх зьмяшчаецца Дом Селяніна, лясьніцтва, почта.

Зайшлі ў лясьніцтва.

Куча тапароў, піл і падобных прыладаў зразу кінулася ў вочы...

— Скуль гэта ўсё? — пытае Аляксандр Грыгоравіч у ляснічага.

— Сяляне лес сякуць, вось мы і адбіраем. Думаем у павятовы аддзел сацыяльнай забясьпекі перадаць — хай раздаюць...

А пакуса для сялянства не малая. У самых хаты струхнелыя, лесу свайго няма, а лясныя масывы непадалёку — ня дзіва, што спакусіцца можна, ня дзіва, што сотні піл і тапароў ляжаць у канцылярыі лясьніцтва...

Пасьля лясьніцтва зайшлі ў бальніцу, якая крокаў сто ад былўшых палацаў...

Доктар Наўроцкі... Відаць па ўсяму, што не за страх, а за сумленьне працуе ў гэтай пушчы, амаль за сто вёрст ад чыгункі... Скардзіцца, што няма лякарстваў, няма чым перавязкі рабіць. А хворых шмат... Есьць дні, што да двух сот чалавек прыходзіцца прымаць. Аляксандр

Заканчэнне. Пачатак у № 11.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ



Грыгоравіч цікавіцца, якія хваробы больш усяго сустракаюцца...

— Ды шмат чым хварэюць,— кажа доктар,— а большасьць — гэта сухоты і пранцы (сіфіліс). Ёсьць вёскі, дзе бадай усе жыхары заражаны пранцамі... К таму ж сялянства сароміцца лячыцца ад такой хваробы, запускае і разносіць яе на людзей здаровых... Безумоўна, што хвароба гэта прынесена сюды. Але знайшла добры грунт і хутка ахапіла вялікі процант сялянства — больш моладзь хворая...

Абыйшлі хворых... Доктар Наўроцкі, як відаць, любіць сваю справу, любіць сялянства, умее да яго падыйсьці... Ён ня толькі доктар, а і грамадзянскі дзяяч. Усім цікавіцца, аб усім распытвае... Больш, вядома, клапоціцца аб палажэньні бальніцы, якая нясе дапамогу ўсяму вакружнаму сялянству...

А ў валасьці Рэкта, некалькі дзесяткаў вёрст ад Доўска, ужо нас чакалі з самай раніцы. З бліжэйшых вёсак сяляне даведаліся, што будзе ехаць усебеларускі староста Чарвякоў. Прыйшлі нарачна пабачыць, пагутарыць...

Спаткаў старшыня валіспалкому Дзергачоў... Зайшлі ў валасьць...

Большасьць вывесак на беларускай мове. Чуваць і гутарка беларуская...

Гэта адзін з глухіх куткоў нашай Савецкай краіны.

А каля валасьці расьце і шырыцца грамада сялян...

Сяляне сталыя — барадачы. Ёсьць нават такія сярод іх, што ў турэцкай вайне пабывалі.

Большасьць апрануты ў сьвяточныя сьвіткі.— Абшытыя чорнай тасемачкай каўнер, берагі ў падоле і кішэні. Гэта і ёсьць характэрная беларуская сьвітка, якую ў Меншчыне трудна адшукаць... Толькі часам на сцэне прыходзіцца бачыць. А тут, у Магілеўшчыне, гэта яшчэ жыве.

Кабеты таксама ў вопратках саматканых — рознакаляровых андараках, са старынным убраньнем на галаве... Вачэй ня можна адарваць: так гэта ўсё выглядае прыгожа.

Ніводнай крамнай вопраткі так і не давялося спаткаць.

— У нас усе так ходзяць,— адказвае селянін на маё запытаньне,— няма грошай крамнае купляць. Ды сваёй работы тканіну прыямней на целе насіць... Так бацькі і дзяды нашы жылі...

Сабраліся ўсе ў школу.

Кабеты каля парогу стаяць, а мужчыны паселі на лаўкі... Папрасілі пазваленьня закурыць... Дзяды сівабародыя пахкаюць люлькі, вачэй ня зводзяць з усебеларускага старасты...

Адзін не сьцярпеў і сказаў:

— Вось ужо і ў сьне ня сьнілася, што такі госьць прыедзе да нас, у такую глушу... Каліс Міхал Іванавіч Калінін тут праяжджаў. Да нас тагды не заехаў...

Чарвякоў кажа невялічку прамову. Апавядае, што яму прышлося бачыць, праяжджаючы беларускія вёскі... Старыя хаты, бедныя сяляне, худая жывёла. Але ёсьць настрой, ёсьць вера ў свае сілы,— а гэта самае галоўнае...

— А як жа мы будзем гутарыць з вамі,— кажа Чарвякоў,— ці на той мове, на якой я пачаў гаманіць, ці вось так, як цяпер гавару з вамі?..

Грамада адказвае...

— Лепш так, як цяпер кажаце... Яно неяк спрытней для нас, і адказаць ямчэй...

— Значыцца, па беларуску?..

— Але!.. Ды хто яго ведае па якому гэта... Гэта проста па нашаму,— пачуўся з грамады голас...

Некаторыя сяляне ўсьміхнуліся...

Ну, а далей пайшлі гутаркі.

— Ты ж наш бацька, таварыш Чарвякоў, парай, што рабіць: хаты ды хлеўчыкі пагнілі, як і самі заўважылі, едучы праз нашу вёску, а лесу няма новае будаваць... не дае нам уласьць наша... Пойдзем гнілое палена дроў узяць, ці гальля паломанага — вартаўнікі тапор адбіраюць, ды яшчэ ў суд цягнуць за самапраўную парубку лесу... Уся вёска без тапара жыве... лясьніцтва пазабірала.

Мне адразу прыпомнілася куча тапароў і піл, якую сапраўды паказваў лясьнічы...

— Самі ня ведаем, што рабіць, валасьць не дапамагае, чакае загаду з павету, а павет і пагэтуль справы не вырашае, як дастаць лесу...

— Зямлі таксама мала. Шмат хто хоча выехаць ад гэтуль, а рэшта сялян хоча на хутары высяляцца,— ня можна далей так жыць, цяжка...

— А як зямлю думаеце разьмяркоўваць?

— Падушна!.. Усе хочуць падушна!..

Больш двух гадзін вялася гутарка. Сяляне сьмела выказвалі сваю крыўду, прасячы свайго старасты дапамагчы ім уладаваць зямельныя справы і справы з лесам.

— Хоць бы той лес, які калісьці быў нашым, які ня мае ніякага значэньня для дзяржавы, аддалі нам... А то кажуць ёсьць такая пастанова, а лесу і няма... Хоць на дровы ды бервянцо хляўчук залатаць...

Чарвякоў шмат аб чым растлумачыў сялянам, чаму так хутка дзяржава ня можа зрабіць таго, што хоча зрабіць для сялян, чаму не хватае зямлі ў Беларусі, чаму яшчэ лесу ня далі сялянству на адбудову...

Сяляне ўважна слухалі, са ўсім згадзіліся і засталіся пераконаны, што ў хуткім часе жыцьцё сапраўды палепшыцца...

Пасьля сходу мы зайшлі да сялян-жыдоў. Тут іх ёсьць некалькі гаспадарак. Гаспадарку вядуць ужо даўным-даўно і вядуць ня горш усіх сялян... Досьць пажылы гаспадар нас прыемна спаткаў і пачаў гутарыць аб сваёй працы,— як ён перайшоў да сельскай гаспадаркі.

— Можа, хто думае, што мы ня ўмеем гаспадарыць, што ня ўмеем араць да касіць — хай прыдзе пабачыць... Толькі дайце зямлі нашаму брату — справімся ня горш любога селяніна...

Сяляне, якія сталі тут-жа, паддаквалі, што сапраўды жыды гаспадараць ня дрэнна, у чым яны пераканаліся ў працягу многіх дзесяткаў гадоў...

Ужо надыходзіў вечар, і мне прышлося патарапіць Аляксандра Грыгоравіча ехаць далей...

Застанавіліся ў Прапойску. Тут спаткалі Чарвякова зусім ужо арганізована, з чырвонымі сьцягамі...

— Ня-хай жы-ве ўсе-бе-ла-рускі ста-рас-та та-ва-рыш Чар-вя-коў!..

Несьліся па вуліцы гучныя выкрыкі камсамольцаў і піянэраў, якія сталі каля валасьці ў стройных шэрагах...

Начальнік міліцыі падышоў з рапартам, як гэта і водзіцца. Прышлося толькі пазнаёміцца са школьнай выстаўкай, дзе вучні, камсамольцы і піянэры прымусілі разам з імі сфатаграфавацца...

Пад гучнае «ура» шматлікай грамады мы пакінулі Прапойск.

У чырвоным бляску заходзячага сонца купаліся бярозы і сосны абапал дарогі. Аўтамабіль з шумам нёсься ўперад і ўперад — толькі паломаныя масты прымушалі суцішаць ход. Шофэр на кожным мосьце паціху запускаў моцнае слаўцо...

Здалёку пачалі паказвацца сярод зеляніны будынкі...

Гэта віднеўся Чэрыкаў...

Чэрыкаў быў раней павятовым горадам, а зараз — толькі валасьць.

Як толькі ўсебеларускі староста ўвайшоў у памяшканьне валасьці, то зараз жа яму пасыпа-

лі пэтыцыі ад мясцовых працаўнікоў і ад жыхарства...

Аб чым, думаеце, прасілі?

Прасілі і даказвалі, што Чэрыкаў павінен быць вокругам...

— Ужо адно тое, што Чэрыкаў прыгожы сам па сабе гарадок... Ен нават і раней быў паветам. Есьць шмат будынкаў, стаіць на шасэйнай дарозе, мае за сабой гістарычнае мінулае.

Такую выстаўлялі аргумэнтацыю... Сапраўды, Чэрыкаў выглядзіць вельмі прыгожа. Увесь у зеляніне, ёсьць нішто сабе і будыніны. Вялікі лік жыхароў... Але Чарвякову прышлося тлумачыць падайцам пэтыцый, што падзел на вокругі і райёны Савецкай Беларусі адбываецца не па прынцыпу прыгожасьці гарадоў і валасьцей, а па адміністрацыйна-эканамічнай выгаднасьці... Бязумоўна, што мяйсцовыя патрыёты не перасталі настаіваць на сваём...

Ужо агартаў змрок сваімі чорнымі скрыдламі гэты ў далёкай глушы Магілёўшчыны гарадок. Як нам мяйсцовыя запрапанавалі, паехалі за тры вярсты за горад у школу-камуну.

Спачатку, па дарозе з глыбокімі выбоямі, а пасьля па ізьвілістай дарозе сярод густога сасновага лесу аўтамабіль прымчаў нас у буйны маёнтак Лемень, дзе і зьмяшчалася вядомая ўсёй акрузе школа-камуна.

Школа-камуна аснована вядомым палітычным і грамадзянскім дзеячом Лепяшынскім, які тут жа трагічна скончыў сваё жыцьцё... Яго забадаў бык, ад якога яму прышлося бараніць вучня.

Камунары-леменцы, як у іх усе называюць, рабоча-сялянская моладзь.

Нязмаўкаемымі авацыямі яны сустрэлі ўсебеларускага старасту. Акружылі аўтамабіль з просьбай начаваць у іх камуне...

Усе, як адзін, здаровыя, загарэлыя хлопцы... Дзяўчаты-камунаркі таксама выглядзяць бадзёра і прыгожа...

Пытаем, як пайшлі ў камуну...

Цікава апавядаюць, як прышлося ім разрывацца з хатнімі, як трудна было першы раз наладзіць гаспадарку і завяваць той аўтарытэт, якім яны зараз карыстаюцца, як перад савецкімі і партыйнымі ўстановамі, так і перад усім грамадствам...

— Першы год, калі пайшлі ў камуну,— апавядае камунар, вясковы хлапец,— трымалі такую-сякую сувязь з бацькамі. Прыходзілася іншы раз хлеба ды бульбы захапіць, каб хоць чым колечы пажывіцца... Ну, а цяпер справу так паставілі, што ў вёску ехаць ня трэба,— усё сваё маем... Вось ідзіце паглядзіце.

Аляксандр Грыгоравіч адправіўся з некалькімі камунарамі пазнаёміцца з фермаю, з агародамі, памяшканьнем, дзе жылі камунары...

А грамада камунараў і камунарак мяне апанавалі, каб я абавязкова сам пачытаў ім свае вершы...

— Мы ўжо ведаем, што вы пішаце вершы і ня выпусьцім з камуны, пакуль не пачытаеце. У нас таксама ёсьць шмат паэтаў. Нам цікава пазнаёміцца з беларускай паэзіяй... Мы ня можам нідзе дастаць беларускай літэратуры. Толькі газэту палучаем — «Савецкую Беларусь»...

І тут жа мне падалі дадатак да газэты — «Радавую Рунь», дзе быў выдрукаваны мой верш...

Пасьля прачытання аднаго з сваіх вершаў і некалькіх слоў аб беларускай літэратуры, аб напрамку беларускай поэзіі грамада камунараў засталася надзвычайна задаволеная.

— Усё гэта знаёма нам,— казалі хлопцы і дзяўчаты,— у нас так і гавораць, у нас усе гэтыя малюнкі ў жыцьці ёсьць, якія гэтак паэтычна беларуская літэратура апісвае... Блізкое нам...

А пасьля камунаркі папрасілі агледзець самыя прыгожыя мясьціны абшараў камуны...

Нас, чалавек дзесяць, села ў лодку і паплылі па глыбокім, наўкола пазаросшым дрэвам возеру, якое знаходзілася ў кроках дваццацёх ад памяшканьня...

Не даяжджаючы да берагу возера, я пачуў народныя беларускія сьпевы... Гэта на высокім ганку камунарскага будынку камунары акружылі Аляксандра Грыгоравіча і пелі яму беларускія песьні...

Пасьля адзін з паэтаў-камунараў прачытаў сваю паэму, у якой проста і наіўна было апісана некалькі малюнкаў з інтымнага жыцьця камуны.

Было зусім цёмна, калі мы вярталіся ў Чэрыкаў.

Адзін з камунараў, бойкі зухаваты хлапец, падсеўшы з намі пад'ехаць у горад, цікава апавядаў нам, як ён і яшчэ два камунары хадзілі пяхтурою ў Менск, каб раздабыць сродкі на істнаваньне камуны...

Вечарам у мясцовым садзе адбываўся мітынг з выпадку прыезду ўсебеларускага старасты. Сабраўся ўвесь Чэрыкаў. Доўга прышлося чакаць, бо электрычная станцыя чамусьці не пасьпела ўладаваць электрычных лямпачак на мейсцы мітынгу...

Гарачыя прамовы прывітаньня Чарвякову, якія гаварыліся мяйсцовымі працаўнікамі, камсамольцамі і піянэрамі, выклікалі буру воплескаў грамады...

Апошнім слова ўзяў Чарвякоў. Пры словах яго прамовы аб міжнародным становішчы, што «мы павінны заўсёды ўлічваць тыя абставіны, што на нас у любы момант можа насунуцца навальніца і быць да гэтага гатовымі...», сапраўды загрухацеў гром...

Чорныя хмары заслалі неба. Пачала раз-по-раз асьвечваць бліскавіца. Узьняўся вецер... Дрэвы шумелі і гнуліся да зямлі...

Пачыналі падаць буйныя каплі дажджу...

На гэтым мітынг прышлося закончыць...

## 14 чэрвеня

З самага раньня тав. Чарвякоў пачаў абыходзіць бібліятэку, дзіцячы сад, школы і некаторыя савецкія ўстановы.

Што зрабіла прыемнае ўражаньне,— гэта пастаноўка справы ў жыдоўскім дзіцячым доме. Ва ўсім відаць старраннасьць выхавацеляў і каханьне сваёй справы.

Мне прышлося ў сямёхлетцы прачытаць лекцыю аб беларускай літэратуры і азнаёміць з некаторымі беларускімі творамі прыгожага пісьменства.

Апрача вучняў і настаўнікаў на лекцыю прышлі і камунары-леменцы, якія раней прасілі ў іх чытаць гэту лекцыю.

У школе адбываліся зачоты. Пасьля лекцыі паслухаць, як вучні здаюць зачоты, быў запрошан тав. Чарвякоў...

— А вось наконт беларускага ў нас слаба,— гаварылі настаўнікі,— і не затым, што вучні або мы непрыемна адносімся да гэтай дысцыпліны, а бяда ў тым, што мала настаўнікаў, ведаючых беларускую мову і літэратуру, а таксама няма і падручнікаў. Адна толькі кніжка маецца на ўсю сямёхлетку — ніяк не разарвешся...

Тут крыху і сьмешна і крыўдна... Школа папрасіла Чарвякова на памятку з імі сфатаграфавацца...

— Не адкажыце, тав. Чарвякоў. Такі госьць у такім глухім кутку. Другі раз ці заедзеце калі да нас. Вучні ўсе хочуць сфатаграфавацца з вамі — з усебеларускім старастам... З такой жа просьбаю падасьпелі і камунары-леменцы...

— Мы хлопцы таго, такога выпадку не прамінем, тав. Чарвякоў...

Аляксандр Грыгоравіч толькі прыветна ўсміхаўся, стоячы сярод той сілы, за якой вялікая будучыня, якая не са страху ідзе на зьмену сваім старэйшым барацьбітам і клянецца ажыцьцявіць іх ідэю...

Пачуўся гудок аўтамабіля. Гэта шофэр Васільеў напамінаў, што пара ехаць далей, каб я даганяў Аляксандра Грыгоравіча...

Стройныя шэрагі запальных камсамольцаў і піянэраў, вучні і настаўнікі праводзілі нас гучлівым «ура».



ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы